Источник: "Культура" - 2013-08-24

# Свята славістыкі

**Прадстаўнічы міжнародны форум гэтымі днямі праходзіць у беларускай сталіцы: наша краіна ўпершыню ў гісторыі атрымала права прыняць у сябе Міжнародны з'езд славістаў, які праводзіцца раз на пяць гадоў.**

Як адзначыў у прывітальным слове да ўдзельнікаў знакавай падзеі Прэзідэнт нашай краіны, сімвалічна, што месцам правядзення юбілейнага форуму абрана Беларусь — "сэрца" славянскай цывілізацыі, — якая ўносіць важкі ўклад у захаванне яе каштоўнасцей і ідэалаў. Кіраўнік дзяржавы ўпэўнены, што гэты З'езд дапаможа лепш зразумець ролю славянства ў цывілізацыйным працэсе, аб'яднаць намаганні ў вывучэнні ды папулярызацыі гісторыі, моў і культур нашых народаў.

Па словах міністра культуры нашай краіны Барыса Святлова, беларусам ёсць чым ганарыцца, ёсць што паказаць свету са здабыткаў славянскай культуры. У прыватнасці, на думку міністра, шматвяковыя традыцыі пісьменства і асветы з'яўляюцца тымі складнікамі, якія даюць нам падставу быць роўнымі з усімі славянскімі народамі. Барыс Святлоў выказаў упэўненасць, што супрацоўніцтва вучоных-славістаў з розных краін з'яўляецца вельмі перспектыўным і будзе, несумненна, садзейнічаць міжкультурнаму дыялогу.

У рабоце З'езда прымаюць удзел больш за 600 навукоўцаў з 35 краін, у тым ліку з Аўстрыі, Аўстраліі, Бельгіі, Беларусі, Балгарыі, Германіі, Ізраіля, Італіі, Іспаніі, Канады, Літвы, Расіі, Францыі, Швейцарыі, Японіі ды іншых. Цягам пяці дзён (закрыццё З'езда запланавана на 26 жніўня) адбываюцца пленарныя і секцыйныя даклады, "круглыя сталы", пасяджэнні спецыяльных камісій, акрэдытаваных пры Міжнародным камітэце славістаў.

Акрамя таго, у рамках З'езда ў сталічным Лінгвістычным універсітэце адкрылася тэматычная выстаўка літаратуры, выдадзенай за апошнія пяць гадоў у розных краінах свету. На ёй можна ўбачыць спецыялізаваную літаратуру для вузкага кола прафесіяналаў (напрыклад, выданні па славістыцы на італьянскай мове) і кнігі для больш шырокай аўдыторыі, у ліку якіх — слоўнікі, працы па літаратуразнаўстве.

Сярод іншага, беларускую аўдыторыю маюць зацікавіць выданні, у якіх прадстаўлены даследаванні дыялектаў беларускай мовы ў краінах-суседках. Усе гэтыя кнігі з больш чым 20 краін будуць перададзены ў дар Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

К.А. Свята славістыкі **К.А.**